# СКАНВОРД

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сорт скуры | | | | Гук пры трэнні | | | | | |
| Ма-лады спартс-мен | | Атака сама-лёта | | Дроб-нае рэша-та | |  | | | |
| «Гар-чычны» газ | | | | | | | | | |
| Адзін перыяд у фут-боле | | Тып плода ў рас-лін | | Род мятлы з ма-чалы | | | | | |
| | | | | | Шака-ладнае дрэва | Ства-раль-нік свету | | | |
| | Доля крэ-дыту | | Орган зроку | | | | | Від тэа-траль-нага ма-стацтва | |
| | Дрэн-ная та-ра для шыла | | | | Белару-скі кіна-дакумен-таліст | | | | |
| | | | Гіста-рычны перыяд | | | | | | Бег пад крыкі "Ура!" |
| Кіну-тая дро-бязь | | Даўней-шая наз-ва літа-ры "ы" | Зброя для фехта-вання | | Скла-дзеныя ў пучок кветкі | | | | |
| | | | | | Пуста-зелле сям. зла-кавых | | Частка мале-кулы | | Самец казы |
| | Таксі ў краі-нах Азіі | Зялё-ны ліст цыбулі | | Сім-вал свя-тасці | | | | | |
| | Спада-рыня ў Вар-шаве | | | | |  | | | |
| | | | | | | | | | |
| | Птушка з чырво-най груд-кай | | | | | | | | |
| | Азарт-ная кар-тачная гульня | | Самае глыбо-кае возера | | | | | | |

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Юхт. Скрып. Ірбіт. Траншэ. Бог. Вока. Эра. Алай. Мех. Букет. Атам. Рыкша. Ганак. Пані. Снягір. Рамс. Байкал.

**Па вертыкалі:** Юніёр. Таран. Сіга. Папугай. Тайм. Арах. Шваба. Балет. Какава. Атака. Еры. Расія. Шпага. Гіра. Казёл. Пяро. Німб.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.57 | 21.33 | 16.36 |
| Віцебск — | 4.39 | 21.30 | 16.51 |
| Магілёў — | 4.47 | 21.23 | 16.36 |
| Гомель — | 4.52 | 21.12 | 16.20 |
| Гродна — | 5.14 | 21.47 | 16.33 |
| Брэст — | 5.23 | 21.39 | 16.16 |

## Месяц

*Маладзік 10 ліпеня. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.** Ювеналія.*
***К.** Генрыха, Давыда, Уладзіміра.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 15 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1876** год — нарадзілася (фальварак Пешчын, цяпер Шчучынскі раён) Цётка (Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч), беларуская паэтэса. Адна са стваральніц Беларускай сацыялістычнай грамады, арганізатар рэвалюцыйных рабочых гурткоў. У 1906 годзе эмігрыравала ў Галіцыю, вучылася ў Львоўскім універсітэце, пасля была вольнай слухачкай Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. У 1911 годзе выступала з тэатрам І. Буйніцкага па Беларусі, арганізавала тайныя беларускія школы ў Вільні, Лідскім павеце. У 1914 г. у Мінску заснавала часопіс для дзяцей «Лучынка», праводзіла агітацыйную работу сярод рабочых. Аўтар зборнікаў вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская», кнігі «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Даследавала гісторыю беларускага тэатра, выступала як публіцыст.



**1900** год — нарадзіўся (вёска Агароднікі, цяпер у Пастаўскім раёне) Уладзімір Дубоўка, беларускі паэт, празаік, перакладчык, крытык. Настаўнічаў, працаваў інспектарам беларускіх школ Наркамата асветы РСФСР. Выкладаў беларускую літаратуру ў Камуністычным універсітэце народаў Захаду, працаваў таксама рэдактарам «Збору законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага ўрада Саюза ССР». Член літаратурна-мастацкіх аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». Тройчы быў рэпрэсаваны. Канчаткова рэабілітаваны ў 1957-м. Аўтар паэтычных зборнікаў «Строма», «Там, дзе кіпарысы», «Трысцё», «Credo». Пісаў для дзяцей. Аўтар артыкулаў пра беларускую літаратуру, фальклор, нацыянальную культуру. Выступаў як перакладчык.

У свеце

**1240** год — Аляксандр Неўскі са сваім войскам атакаваў ваенны лагер шведаў на Няве і нанёс ім поўнае паражэнне (Неўская бітва).

**1410** год — паражэнне войскаў Тэўтонскага ордэна ў Грунвальдскай бітве ад беларуска-літоўскіх і польскіх войскаў, што дазволіла спыніць экспансію ордэна на землі Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага.

**1606** год — нарадзіўся Харменс ван Рэйн Рэмбрант, галандскі жывапісец, рысавальшчык і афартыст. Аўтар знакамітых палотнаў «Вяртанне блуднага сына», «Начны дазор», «Даная» і іншых.

**1783** год — у Францыі, на рацэ Соне, каля Ліёна, інжынерам-самавукам Клодам дэ Жафруа д'Абанам выпрабаваны першы ў гісторыі параход.

**1923** год — адкрылася першая ў Савецкім Саюзе рэгулярная паветраная лінія па маршруце Масква — Ніжні Ноўгарад.

**2002** год — курс еўра ў ходзе таргоў зраўняўся з курсам долара (1,0018 долара за 1 еўра). Адзіная еўрапейская валюта дасягнула парытэту з доларам упершыню з лютага 2000 года.

Так гаварыў...

**ПУБЛІЙ СІР:**

*«З чужой бяды не рабі сабе радасці».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Люся тэлефануе Кірылу з гасцей:**
**— Кірыл, дарагі, на пліце варыцца суп, я ў гасцях у Ганначкі, праз хвілінку выходжу... А ты памешвай суп... Кожныя паўгадзіны.**

— Падсудны, вы навошта кінулі камень у прадавачку і разбілі ёй галаву?
— Гэта быў не камень, а яе «свежая булачка»!

**— Грыша! Ты чаму спазніўся на работу?**
**— А што? Я павінен перарэзаць урачыстую стужачку, каб яна пачалася?**

Што такое розніца ва ўзросце? Гэта калі муж распавядае, што любіў у дзяцінстве глядзець дыяфільмы, а жонка пытаецца, што гэта такое.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспл. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1883.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 ліпеня 2021 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12